Ogłoszenia parafialne

ADWENT IV niedziela 19.12.21

18 grudnia 2021

na nядзелю 19.12.2021.

1. Рараты у панядзелак, сераду а 6.45.
2. У канцылярыі альбо па тэлефоне можна запісаць хворых, якім трэба прыступіць да споведзі і св. Камуніі. Прашу ўсіх паклапаціцца аб сваіх блізкіх. Адведзіны хворых па горадзе – 23 снежня, а ў вёсках – 22 снежня.
3. У сераду а 11.00 запрашаю на дапамогу для упрыгожвання капліцы на Божае Нараджэнне.
4. Св. Імша на Урачыстасць Божага Нараджэння ў 00.00 “пастэрка”, а таксама а 11.00. А 15.00 святой Імшы не будзе.
5. У нядзелю – свята Святой Сям’і: Езуса, Марыі і Юзафа. На святых Імшах адбудзецца аднаўленне сужэнскіх абяцанняў. Запрашаю сужэнцаў, якія атрымалі шлюб у касцёле/царкве. У нядзелю таксама ўспамін св. Стэфана, першамучаніка (благаслаўленне аўса).
6. У нядзелю пасля св. Імшы ў 11.00 – уручэнне падарункаў дзецям за ўдзел у раратах.
7. Запрашаем прыняць удзел у конкурсе сямейных стаенак на Божае нараджэнне. Стаенку сям’я можа зрабіць паводле ўласнага праекта і метада. Важна, каб у працы была задзейнічана ўся сям’я. Зробленую стаенку і малюнкі трэба прынесці ў капліцу да 24 снежня 2021 г.
8. Пасля св. Імшы на выхадзе з капліцы можна купіць аплатак на вігілійны стол за дабравольную ахвяру
9. На дошцы аб’яў, а таксама на парафіяльным сайце расклад душпастырскай візітацыі (каляды).
10. 10. Дзякую за складзеныя ахвяры.